# ПЛЕНАРНЫЯ ВЫСТУПЛЕННІ

УДК 93/94:378.4(476-25).096”1921/1991”

## ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНАЕ АФАРМЛЕННЕ ВЫВУЧЭННЯ І ВЫКЛАДАННЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ (1921–1991 гг.)

***А. А. Яноўскі***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, helgoleg@mail.ru*

Праследжаны важнейшыя арганізацыйныя, адукацыйныя і навуковыя складнікі фарміравання ў савецкай Беларусі разумення неабходнасці распрацоўкі поўнавартаснай айчыннай гісторыі. Гэтае разуменне мела як суб’ектыўна-асабістые праяўленні, так і відавочна палітыка-ідэалагічнае суправаджэнне. Разгарнуўшаяся ў маштабах СССР «барацьба на гістарычным фронце» праходзіла найбольш востра і прывяла да велізарных інтэлектуальных стратаў, прыніжэння першых поспехаў у распрацоўцы навуковых праблем і адбудаванн эфектыўных адукацыйных структур, перш-наперш у Беларускім дзяржаўным універсітэце. На разнастайным матэрыяле крыніц разглядаюцца этапы выкладання гісторыі Беларусі ў БДУ, страты і поспехі ў напісанні сістэмнай «Гісторыі Беларускай ССР» і некаторых навуковых работ, доўгі шлях да стварэння асобнай кафедры «гісторыі БССР». Увесь расказ грунтуецца на прыкладах, на разглядзе канкрэтных лёсаў беларускіх гісторыкаў.

***Ключавыя словы:*** *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; гісторыя Беларусі; кафедра; падручнік; ідэалогія; гісторык і ўлада.*

## ИНСТИТУЦИОНАЛЬНОЕ ОФОРМЛЕНИЕ ИЗУЧЕНИЯ И ПРЕПОДАВАНИЯ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ В БЕЛОРУССКОМ ГОСУДАРСТВЕННОМ УНИВЕРСИТЕТЕ (1921–1991 гг.)

***О. А. Яновский***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, helgoleg@mail.ru*

Прослежены важнейшие организационные, образовательные и научные составляющие формирования в советской Беларуси понимания необходимости разработки полноценной отечественной истории. Это понимание имело как субъективно-личностное проявление, так и очевидно политико-идеологическое сопровождение. Развернувшаяся в масштабах всего СССР «борьба на историческом фронте» в БССР проходила наиболее остро и привела к большим интелллектуальным потерям, утрате первых успехов в разработке научных проблем и выстраивании эффективных образовательных структур, прежде всего в Белорусском государственном университете. На обширном источниковом материале рассматриваются этапы в преподавании истории Беларуси в БГУ, потери и успехи в написании системной «Истории Белорусской ССР» и некоторых научных работ, долгий путь к созданию отдельной кафедры «истории БССР». Весь рассказ строится на примерах, на рассмотрении конкретных судеб белорусских историков.

***Ключевые слова:*** *Белорусский государственный университет; история Беларуси; кафедра; учебник; идеология; историк и власть.*

## INSTITUONALIZED STUDY AND TEACHING OF THE HISTORY OF BELARUS AT THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY (1921–1991)

***O. Yanovsky***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, helgoleg@mail.ru*

The most important organizational, educational and scientific components of the formation in Soviet Belarus of the understanding of the need to develop a full-fledged domestic history are traced. This understanding had both a subjective and personal manifestation, and obviously political and ideological support. The «struggle on the historical front» that unfolded across the entire USSR in the BSSR was the most acute and led to great intellectual losses, the loss of the first successes in the development of scientific problems and the construction of effective educational structures, primarily within the Belarusian State University. The extensive source material examines the stages in teaching the history of Belarus at the Belarusian State University, the losses and successes in writing the systemic «History of the Belarusian SSR»

and some scientific works, the long way to creating a separate department of the «history of the BSSR». The whole story is built on examples, on the consideration of the specific fate of Belarusian historians.

***Key words:*** *Belarusian State University; history of Belarus; department; textbook; ideology; historian and government.*

Пад тэрмінам «інстытуцыянальнасць» у заяўленай тэме маюцца на ўвазе некалькі складнікаў: прыхіленне беларусаў да сваёй гісторыі і першыя спробы яе вылучыць з, у першую чаргу, расійскай і польскай; першыя крокі ў развіцці гістарычнага беларусазнаўства; арганізацыя сістэмнага выкладання гісторыі Беларусі ў галоўных яе складніках (палітычныя, эканамічныя, прававыя, культурныя і іншыя аспекты); падрыхтоўка педагагічных і навуковых кадраў; стварэнне арганізацыйных структур у БДУ, Інстытуце беларускай культуры і затым Беларускай акадэміі навук. Зразумела, гэта не поўны пералік магчымых дэфініцый тэрміну, вынесенага ў назву. У нашым выпадку, называючы некаторыя прыклады інстытуцыянальнага развіцця ў цэлым, больш увагі звернем на дзве акалічнасці: як у рэшце рэшт у структуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з’явілася поўнавартасная кафедра гісторыі Беларусі і як на працягу 1920–1960-х гг. ішло напісанне падручніка па айчыннай гісторыі, які б задаволіў грамадскія і ўладныя ўяўленні аб ёй. Прыдзецца злучыць у тэксце дастаткова шмат дробнай інфармацыі са спасылкамі ў большай ступені на архіўныя дакументы.

Вядома, што праблемы беларускай гісторыі амаль што з «нулявой» стадыі навуковага разумення сталі распрацоўваць як даследчыкі-беларусы, так і навукоўцы не беларускага паходжання. Апошнія змаглі натуральна дапоўніць свой творчы патэнцыял нязведанымі сюжэтамі, праблемамі, накірункамі беларускай гісторыі, пранікнуцца павагай да яе. Напрыклад, той жа У. І. Пічэта з 515 сваіх друкаваных прац каля 180 прысвяціў яе даследаванню, публіцыстычнаму прадстаўленню тых ці іншых аспектаў, пазначэнню неабходнасці беларусамі ўспрымаць гісторыю сваёй зямлі і сваіх продкаў як найвялікшую і каштоўную спадчыну [1; 2]. У. М. Перцаў і М. М. Нікольскі дапоўнілі свой творчы багаж даследаваннямі розных пытанняў беларускай гісторыі толькі з прыездам на сталую працу ў БДУ.

У каторы раз прыходзіцца звяртаць увагу на выключную роль У. І. Пічэты не толькі ў распрацоўцы навуковых пытанняў, але і ў арганізацыі сістэмнага вывучэння і выкладання гісторыі Беларусі. Ён зрабіў такі ўнёсак, што без яго творчай спадчыны нельга ўявіць гісторычную навуку Беларусі XX стагоддзя. Ён адным з першых паставіў пытанне аб неабходнасці стварэння адмысловага Інстытута беларускай культуры з выключным гістарычным ухілам. І сам адзначаў: «Фактически ж в основу устава Инбелкульта был положен мой проект». А потым актыўна працаваў у ім, адначасова прасоўваючы ідэю Беларускай акадэміі навук. Пад час зняволення і чакаючы прысуду Уладзімір Іванавіч дастаткова аб’ектыўна ацаніў свае намаганні: «<...> я поставил на прочный фундамент изучение истории, экономики и культуры Белоруссии. Я сам очень много работал, и «<...> под моим руководством продолжали работать более молодые люди в том же направлении» [3, арк. 119 зв., 121 зв., 261; 4, арк. 22].

Нельга абыйсці вядомы факт выкладання Уладзімірам Іванавічам курса беларускай гісторыі слухачам Беларускага народнага ўніверсітэта, які ў 1918 г. быў адкрыты ў Маскве намаганнямі Белнацкама. Ягоная «Гісторыя беларускага народа» праз некаторы час, як лекцыйны курс, будзе выдадзена ў складзе агульнага дапаможніка па беларусазнаўству [5]. Сярод 63 найменняў скарыстаных крыніц названы работы А. П. Сапунова, М. К. Любаўскага, В. Я. Данілевіча, П. В. Галубоўскага, М. В. Доўнар-Запольскага, М. С. Грушэўскага, М. А. Максімейкі, М. Н. Ясінскага, І. В. Якубоўскага, М. Маліноўскага, І. І. Лаппо, М. В. Каяловіча, І. А. Чыстовіча, П. М. Жуковіча, К. В. Харламповіча, П. У. Владзімірава і інш. І гэта быў пэўны гістарыяграфічны прарыў у накірунку напісання першых старонак беларускай гісторыі.

Аб агульным на той час стане гістарыяграфіі ў толькі пэўным дачыненні да беларускай гісторыі напісана не зашмат і з рознымі ўспрыняццямі і ацэнкамі. Напрыклад, нават сучасны расійскі даследчык Міхаіл Кром падае працы М. К. Любаўскага, М. В. Доўнар-Запольскага, І. І. Лаппо ўсяго толькі як «классику литуанистики» [6, с. 15–16]. Таму яшчэ большай нашай павагі заслугоўвае У. І. Пічэта, які амаль што сто гадоў таму разумеў неабходнасць акцэнтаванага, даказальнага вылучэння беларускай гісторыі з векавых наслаенняў «русістыкі-расіязнаўства», «паланістыкі», як і той жа згаданай вышэй «литуанистики» і таксама «украіністыкі». Чаго толькі каштуюць ягоныя высновы аб «Исторических судьбах Белоруссии и Украины», якія ў якасці эксперта-навукоўца ён у 1920 г. даў напярэдадні Рыжскіх

перамоў. Адзін з ягоных канцэптуальных дакладаў наконт задач па неадкладнай распрацоўцы беларускай гісторыі восенню 1922 г. так цытавала цэнтральная беларуская газета «Савецкая Беларусь»: «<...> беларускім гісторыкам трэба перагледзіць старыя аджыўшыя схэмы і саўсім іначай аднесьціся да гісторыі свае стараны. Разглядаць гісторыю Беларусі як частку гісторыі Маскоўшчыны, Літвы ці Польшчы – цяпер ужо шкодна. Трэба безадкладна будаваць гісторыю Беларускага Народу <...>. Таксама раз назаўсёды трэба адкінуць такія перастарэлыя тэрміны, як “Западная Россия”, “западно-русский” <...>. Усюды, дзе йдзець гутарка аб тэрыторыі Беларусі ці аб яе насяленьні, трэба ўжываць толькі іх уласныя іменьні: Беларусь, беларускі» [7]. Гісторык сцвярджаў, што «неабходна стварыць асобную гісторыю беларускага народа з пункту гледжання самаго народа», што адначасова «Вялікія заданьні ляжаць на сучаснай беларускай інтэлігенцыі па разьвіцьцю беларускай мовы і культуры», бо беларуская мова з’яўляецца «фактарам нацыянальна-культурным» [8].

Калі падыйсці да разгляду нашага пытання з боку практыкі педагагічнай, арганізацыі выкладання гісторыі Беларусі, то ёсць неабходнасць спачатку акцэнтаваць увагу на тое, што ўжо ў першыя вучэбныя планы трох факультэтаў БДУ былі ўнесены абавязковыя курсы па розных накірунках беларускай гісторыі. Асабліва шырока яна выкладалася з 1921 г. на факультэце грамадскіх навук, потым на педфаку, а крыху пазней – на факультэце права і гаспадаркі. Адначасова выкладчыкі намагаліся забяспечыць студэнтаў вучэбнай літаратурай. Зразумела, што выкарыстоўвалася ўсялякая літаратура, якая мелася ў бібліятэцы БДУ ці некаторых іншых мінскіх кніжных зборах. Студэнты карысталіся, напрыклад, амаль што першым падобнага тыпу выданнем, якое яшчэ ў 1910 г. надрукаваў асобнай кніжкай В. Ю. Ластоўскі – «Кароткая гісторыя Беларусі». Яны вучыліся па надрукаваным у 1921 г. у Мінску «Кароткім нарысе нацыянальна культурнага адраджэння Беларусі» У. М. Ігнатоўскага [9]. Можна было таксама выкарыстоўваць спецыфічны твор Ф. Ф. Турука аб беларускім нацыянальным і рэвалюцыйным руху [10], некаторыя працы М. В. Доўнар-Запольскага – асабліва гродзенскае і віленскае выданні 1919 г. яго «Асноў дзяржаўнасці Беларусі» і больш позняе – «Народное хозяйство Белоруссии 1861–1914 гг.», якое завершыла прафесарскую карьеру гісторыка ў БДУ і ўвасобіла адпаведны лекцыйны курс, які ён чытаў студэнтам праўгаса БДУ [11]. Ужо ў 1924 г. У. І. Пічэта прадставіў студэнцтву і беларускаму грамадству сваю «Гісторыю Беларусі», выдадзеную, дарэчы, у савецкай Расіі [12].

Размова аб падручніках абсалютна можа быць прадоўжана ў кантэксце прабемы інстытуцыянальнасці, як і ў дачыненні да арганізацыі выкладання, вывучэння, даследавання гісторыі Беларусі. Гэта і вытокі справы, і пэўнае яе падсумаванне. Калі ж пазначыць нейкія этапы развіцця менавіта арганізацыйных структур, а дакладна кафедральнага складніка БДУ, то адразу патрэбна ў каторы раз падкрэсліць неадназначнасць дэфініцыі гэтага тэрміну-назвы.

Напрыклад, можна прыняць да ўвагі выказванне рэктара Пічэты з нагоды 15-годдзя «грамадска-рэвалюцыйнай дзейнасці» У. М. Ігнатоўскага, якое прыйшлося на канец 1923 г. Уладзімір Іванавіч у звароце да свайго калегі, а адначасова і падначаленага (першы дэкан педфаку БДУ з яго сацыяльна-гістарычным і літаратурна-лінгвістычным аддзяленнямі), і начальніка (наркам асветы ССРБ), назваў яго не толькі прафесарам «па катадры беларускай гісторыі», але і тое, што Усевалад Макаравіч стварыў «первую не только в Союзе ССР, но и во всем мире кафедру истории Белоруссии» [13, арк. 6 адв.]. Па-сутнасці, гэта пазначэнне як бы дае права ўспрымаць Ігнатоўскага ў якасці распачынальніка выкладання айчыннай гісторыі на ўніверсітэцкім узроўні, а таксама бачыць за гэтай постаццю фарміраванне адпаведнай інстытуцыі – кафедры. Вось толькі мы будзем памыляцца, калі перанясем цяперашняе наша разуменне кафедры на той час.

Канешне, вывучэнне гісторыі Беларусі ў сістэме адукацыі маладой савецкай рэспублікі не магло ажыццяўляцца інакш, як праз адпаведную арганізацыйную структуру. Перад вышэйшай школай ССРБ у выразе адзінай на першы час установы гэтага адукацыйнага ўзроўню – Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта – некаторы час стаяла відавочная праблема: як ладзіць навучальны працэс, калі старыя формы яго арганізацыі былі амаль што адкінуты новай уладай. Вось і такая натуральная форма, як кафедральны прынцып пабудовы і навучальнага, і навуковага суправаджэння падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшага гатунку, у пачатку 1920-х гг. прыняў дастаткова скажоны выгляд.

Калі ва ўніверсітэтах дарэвалюцыйнай Расіі кафедра прадстаўляла сабой калектыў выкладчыкаў, аб’яднаных агульным накірункам навуковага спазнання і выкладання

адпаведнага пераліку вучэбных дысцыплін, то пасля 1917 г. разам з адмаўленнем ад «старой школы» былі адвергнуты і важнейшыя яе элементы. Проста не магло ісці гаворкі аб тым, каб сарганізаваць кафедру як поўнавартасны калектыў. Так, пад кафедрай сталі разумець нават аднаго, адмысловага спецыяліста-выкладчыка (дакладней – яго вучэбны курс, які ён мог прачытаць). Ва ўмовах катастрафічнага недахопу кваліфікаваных кадраў кіраўніцтву савецкай вышэйшай школы прыходзілася арыентавацца на тых, хто хоць у некаторай меры сваёй папярэдняй дзейнасцю і дачыненнем да навукі мог быць прызнаны карысным для надання той ці іншай кваліфікацыі студэнцтву.

Таму ў дакументах амаль што да канца 1920-х гг. няма падрабязнага распавядання аб кафедральнай структуры ўніверсітэцкіх факультэтаў. Тым больш, што адказнасць за арганізацыю вучэбнага працэсу ў адпаведнасці з статутам савецкай вышэйшай школы была ўскладзена на так званыя прадметныя камісіі. Гэтыя камісіі аб'ядноўвалі ці не ўсіх выкладчыкаў (а прафесараў абавязкова), якія працавалі на тым ці іншым факультэце. І на іх пасяджэннях абмяркоўвалі стратэгію і тактыку выкладання, кадравыя пытанні і шмат чаго іншага. Выключнае ж рашэнне было за дэканатамі і прэзідыўмамі факультэтаў, за Праўленнем БДУ і Саветам універсітэта. Такім чынам, сама назва «кафедра» узнікала ў тагачасных дакументах неяк няўцямліва для нас, якія звыкліся з прадстаўленнем аб гэтай натуральнай і амаль што важнейшай навукова-вучэбнай арганізацыйнай адзінцы любой ВНУ.

Так, ацэньваючы БДУ першага году яго дзейнасці, «Вестник Наркомпроса ССРБ» згадвае 14 прафесараў, 40 выкладчыкаў, 10 асістэнтаў, 9 лектараў і 5 загадчыкаў кабінетамі. Гісторыя выкладалася спачатку на факультэце грамадскіх навук (у большасці – на яго грамадска-педагагічным аддзяленні), а потым на педагагічным факультэце (пераважна на сацыяльна-гістарычным і этнолага-лінгвістычным аддзяленнях) [14, с. 43–46]. І зусім не вядзецца гаворка аб кафедрах, іх кіраўніках! Відавочна (а гэта падцвярджаецца мноствам фактаў), што вучэбны кабінет для забеспячэння выкладання дакладнага накірунку ведаў быў абсалютна важнай рэччу ва ўсёй структуры тагачаснага БДУ. І ён у пэўнай меры як бы браў на сябе функцыі кафедры. Праўда, нельга лічыць загадчыка кабінетам фігурай першаснай на гэтым ці іншым накірунку пазнання. Хаця імі, як правіла, прызначаліся аўтарытэтныя асобы. Як, напрыклад, дацэнт-расіязнаўца і беларус па паходжанню А. А. Савіч. Аляксандр Антонавіч акрамя сваіх лектарскіх абавязкаў яшчэ быў загадчыкам «научного кабинета» [15, с. 45–46, 118].

Дастаткова аб'ектыўную карціну кадравага стану першых гадоў дзейнасці БДУ падаюць радкі з успамінаў Дзмітрыя Пятровіча Канчалоўскага – першага прафесара, які прачытаў першую лекцыю студэнтам БДУ. Ён некалькі з'едліва пісаў, што большасць выкладчыкаў «правінцыяльных» савецкіх вну, да якіх натуральна адносіўся і БДУ, «не имели никаких степеней, но почти все были авторами популярных статей, брошюр и книжек…», хоць былі і такія, хто «не имел никаких печатных "трудов" и производил впечатление людей весьма легковесных в смысле знаний». Такім чынам, прафесарам «мог сделаться всякий, хотя и после признания "профессорской коллегией вуза"», і «профессорами делались» прыват-дацэнты, асістэнты, лабаранты, настаўнікі гімназій і г.д. – каб толькі яны былі «людьми толковыми и имеющими какие-либо специальные познания» [16, с. 159, 164–165].

Калі зноў засяродзіць увагу на станаўленні і эвалюцыі кафедральных і іншых інстытуцый, то патрэбна адзначыць, што, па-першае, яны павінны былі аб'ядноўваць увесь наяўны творчы патэнцыял знаўцаў беларускай гісторыі, а па другое, – разгарнуць работу па яе навуковаму вывучэнню і падрыхтоўцы шырокага кола спецыялістаў-гісторыкаў. Нельга не прызнаць і трэцюю важную функцыю арганізацыйных формаў – распасціранне ведаў аб цяпер ужо беларускай, як айчыннай, гісторыі ў шырокія колы грамадства, сумяшчэнне чыста гістарычнай дасведчанасці з выхаваўчымі, агульнакультурнымі, а адначасова і ідэялагічнымі парадыгмамі.

Той жа Пічэта адзначаў, што з-за адсутнасці ў беларусаў на працягу многіх дзесяцігоддзяў свайго «Унівэрсытэту» даследаваць беларускую мінуўшчыну бралася не адно пакаленне расійскіх гісторыкаў, да якіх ён адносіў беларусаў М. В. Доўнар-Запольскага і А. А. Савіча і ўкраінцаў М. М. Кастамарава і М. С. Грушэўскага [17, с. 145]. Праз гады гэтую ж думку агучыў і першы дэкан універсітэцкага рабфака філолаг В. П. Цёпін, дадаўшы толькі самаго Пічэту да пераліку імёнаў «першапраходцаў» айчыннай гісторыі [18].

Толькі адразу надаць гэтай гісторыі належнае месца, належны статус сярод іншых дысцыплін было цяжка. І справа была нават не ў тым, што існаваў кадравы голад на гісторыка-беларусіста, а ў агульным звыклым з «старых» часоў уяўленняў аб гісторыі беларускай як нейкай дробязі ў рэчышчы гісторыі рускай, расійскай. Па-сутнасці, узровень падобных ведаў тых, хто прыходзіў вучыцца ва ўніверсітэцкія аўдыторыі, быў блізкі да нулявога. Некаторы час нават уступныя іспыты ў БДУ прадугледжвалі выяўленне ў абітурыентаў элементарных прадстаўленняў «по всеобщей русской истории XIX века и Конституции РСФСР» [19, с. 55]. Што казаць, калі ў дзейнасці навуковых таварыстваў БДУ спачатку дамінавалі выступоўцы з дакладамі абсалютна па сюжэтах расійскай гісторыі ці прысвечаныя сучасным яе юбілейным датам.

У некаторай ступені зняць праблемы на падрыхтоўчай ступені для тых, хто меў намер паступаць у ВНУ Беларусі, імкнуўся рабочы факультэт БДУ, на якім сярод іншых амаль што адразу быў створаны адмысловы «беларускі» гурток. Гэтаму ж садзейнічала мэтанакіраванае папаўненне бібліятэкі БДУ кнігамі, якія складалі асобны «беларускі аддзел» [20, арк. 28]. Праз кароткі час педфак дапоўніўся вучэбным кабінетам беларускай гісторыі, які «вырас» з кабінета рускай гісторыі А. А. Савіча. Не без гонару кіраўніцтва БДУ ўжо ў 1923/1924 навучальным годзе адзначала, што гэты і іншыя вучэбныя кабінеты маюць нядрэнныя кніжныя зборы і матэрыялы для дэманстрацый пад час лекцый, і іх ўзначальваюць ці прафесар, ці выкладчык, а «тэхнічную» работу выконвае асобны «навуковы супрацоўнік». Праўда, на першых парах кабінеты былі дастаткова прымітыўнымі, і студэнты, як успамінаў праз некалькі гадоў прафесар-літаратуразнаўца М. М. Піятуховіч, кпілі: «Вось дык габінэт, адразу можна забраць увесь у партфэль» [21, с. 58].

З цягам часу становішча выпраўлялася. Але спадвігнуцца на адмысловы вучэбны музей гісторыі Беларусі не ўдалося ні першаму, ні некалькім наступным пакаленням універсітэцкіх беларусістаў, хаця спробы зрабіць яго прадпрымаліся не аднойчы, пачынаючы з часоў заснавання ў 1924 г. музея гісторыі першабытнай культуры і рэлігіі [22, арк. 7–9; 23, с. 9 ].

Адзначым відавочнае: савецкі дзяржаўны ўніверсітэт адразу спрабаваў скіраваць падрыхтоўку сваіх студэнтаў на аснове «практыкаарыентаваных» курсаў. Гэта адпавядала тагачасным стратэгіям развіцця вышэйшай адукацыі, сярод якіх дамінавалі «прафесійная» і «прагматычная», але абедзьве напоўненыя ідэялагічным зместам. Вось чаму сярод іншых праз усе 1920-я гг. акцэнтавалася ўвага на выкладанні гісторыі «народнай гаспадаркі і права Беларусіі» і абавязкова ў іх дачынення перш да дзяржаўных інстытутаў, а ўжо потым грамадзянскай супольнасці. Таму сам рэктар-гісторык абраў сваёй выкладчыцкай дамінантай курс гісторыі гаспадаркі Беларусі і гаспадаркі Расіі, а не сістэмную, поўнавартасную беларускую гісторыю.

Гэтае становішча можна лічыць і не такім ужо кепскім, бо ўсё ж на кожным кроку дзейнасці і ўсяго калектыву БДУ, і большасці асобных членаў яго выкладчыцкага складу існавала ўстаноўка на разгортванне разнабаковых дзеянняў, скіраваных на пасціжэнне беларускай гісторыі як часткі сусветнай гісторыі. Гісторыя Беларусі ў самым што ні ёсць навуковым суправаджэнні стала адразу, з 1921 года, галоўнай творчай часткай перш за ўсіх для У. М. Ігнатоўскага (крыху часу выкладчыцкую дзейнасць вёў Ф. Ф. Турук, лекцыі наркама падмяняў В. Д. Дружчыц). Зноў адзначым, што ў залежнасці ад выкладаўшыхся курсаў успрымалася і скіраванасць навуковых памкненняў выкладчыкаў. Так, Усевалад Макаравіч часта згадваецца ў якасці прафесара і даследчыка гісторыі беларускай культуры. А расіязнаўца А. А. Савіч названы спецыялістам у вобласці «гісторыі адукацыі ў Беларусіі», бо за імі меліся адпаведныя курсы. Ігнатоўскага дапаўняў В. Д. Дружчыц, хаця сам уяўляў спецыялістам якраз па гістарыяграфіі і крыніцам гісторыі Беларусі. У хуткім часе з прыходам у БДУ І. А. Сербава з'яўляюцца запісы аб дзейнасці «кафедры этнаграфіі Беларусіі» (зразумела, у асобе гэтага выкладчыка) і аб яго такога роду даследаваннях. М. М. Шчакаціхін стаў увасабляць «гісторыю беларускага мастацтва» і адпаведную «кафедру».

Новы расклад прыналежнасці выкладчыкаў да кафедраў падаў рэктар У. І. Пічэта ў сваім вялікім артыкуле, надрукаваным ў адмысловым зборніку, які выйшаў з нагоды дзесяцігоддзя падзей кастрычніка 1917 г. І на 1927 год дастаткова цяжка перакласці на цяперашнія нашыя ўяўленні аб тым, што гэта за структурная частка ўніверсітэту – кафедра. Так, Уладзімір Іванавіч пра сябе піша, што ён на факультэце права і гаспадаркі «займаў кафедру» – ды не адну, а дзве: і «народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі», і «гісторыі расійскага і літоўска-беларускага права» [24, с. 33].

Адзначым, што некаторы час уласна беларуская гісторыя ўспрымалася з вялікай доляй скепсіса ў разуменні яе непасрэднага дачынення да краязнаўства ці яшчэ больш у шырокім кантэксце – да беларусазнаўства. Зразумець гэтую акалічнасць можна: абсалютна відавочнай была яе агульная нераспрацаванасць, пануючая ў шырокіх колах нават адукаванай часткі грамадства спрошчанасць уяўленняў аб «вялікарускай» ці «польскай» прывязцы ўсіх вядомых і невядомых сюжэтаў мінуўшчыны беларусаў. І, такім чынам, магчымасць лёгка яе спазнаць праз гісторыю суседзяў. Гэтыя «завалы» і неабходна было перадольваць. Гісторыкі БДУ, як пазначана вышэй, гэтую праблему добра разумелі.

Важна, што свае задачы гісторыкі не толькі ўсведамлялі, але і рабілі ўсё магчымае, каб іх вырашыць і хутка, і прадуктыўна. Выступаючы на першым з'ездзе даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі (ён праходзіў 17–18 студзеня 1926 г. у Мінску) дацэнт БДУ В. Д. Дружчыц назваў некаторыя перашкоды на шляху падрыхтоўкі беларускай інтэлегенцыі, і сярод іншых тыя, якія «ляжаць у адсутнасці сталых і належна распрацаваных навуковых падручнікаў, якія высвятляюць прыродныя, гаспадарчыя, эканамічныя і гістарычныя веды аб Беларусі» [25, с. 222–223]. Чаму гэты калега У. М. Ігнатоўскага, У. І. Пічэты, М. В. Доўнар-Запольскага ды і таксама і В. Ю. Ластоўскага падверг сумненню навуковую і дыдактычную якаснасць іх прачытання гісторыі Беларусі (а тым больш, што іх аўтарскія падручнікі ўжо меліся на руках), цяжка сказаць. Пэўна, «праблема падручніка» заўсёды праследуе гісторыкаў у незалежнасці ад навуковага стану тэкстаў і колькасці раздрукоўак. Кожны ці амаль кожны навуковец, а тым больш універсітэцкі выкладчык на нейкім этапе прафесійнай дзейнасці назапашвае свае ўяўленні аб «ідэальным» падручніку, які мог задаволіць яго і яго навучэнцаў. Таму апаніраванне адзін аднаму і па гэтаму накірунку – натуральная асаблівасць інтэлектуалаў-гуманітарыяў. У тым ліку і гісторыкаў.

З часам падрыхтоўка падручнікаў ператваралася ў перманентны, бясконцы працэс, у якім навуковы і палітычны складнікі ўступалі паміж сабой у супраціўленне. Ускосна аб гэтым сведчаць эпізоды, звязаныя з выхадам у свет падручніка М. М. Нікольскага і лёсам ссыльнага У. І. Пічэты – яго сябра. Асаблівую цікавасць у кантэксце разглядаемай тэмы прадстаўляе вялікае пісьмо М. М. Нікольскага, якое ён даслаў У. І. Пічэце напрыканцы ссылкі калегі. Мікалай Міхайлавіч палічыў неабходным увесці Уладзіміра Іванавіча ў курс новых абставін «на гістарычным фронце» у Беларусі і распісаў некаторыя падрабязнасці, звязаныя з падрыхтоўкай да адкрыцця ў БДУ адмысловага гістарычнага факультэта: «...Да выкладання належыць зараз звярнуцца на гістарычны факультэт БДУ. Там будзе працаваць Перцаў (па сярэдніх вяках), па гісторыі Беларусі – Шчарбакоў (віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук) і, магчыма, Кернажыцкі (ён ужо дацэнт педінстытута), па расійскай гісторыі і новай гісторыі хочуць зваць з Масквы. І курс ва ўсякім разе забяспечаны мясцовымі сіламі...». Далей Нікольскі паведаміў, што «...Прафесар Шчарбакоў зараз выпусціў курс гісторыі Беларусі; трэба Вам яго выслаць з "макулатурай"» [26, с. 1].

Некаторыя абставіны таго часу з асаблівага боку падавалі рэспубліканскія газеты. Так, В. К. Шчарбакоў у артыкуле «Да адкрыцця гістарычнага факультэта БДУ»" [27] адзначыў, што з 107 гісторыкаў-настаўнікаў сярэдніх школ БССР 104 зусім не выкладаюць гісторыю БССР. Ён праінфармаваў, што з 4-га курса студэнты гісторыкі БДУ (і гэта асаблівасць БДУ!) будуць спецыялізавацца і па гісторыі БССР. Аб гэтай спецыялізацыі згадаў і рэктар А. І. Дзьякаў у сваім артыкуле «На новую, больш высокую ступень» [28]. Ён спаслаўся на тое, што гэтая спецыялізацыя зафіксавана ў пастанове СНК БССР па дакладу аб рабоце БДУ ад 24 мая 1934 г. Але той жа Шчарбакоў у артыкуле «Да ўсебеларускай канферэнцыі гісторыкаў» [29] падкрэсліў той факт, што ў першым паўгоддзі 1934/35 н.г. гісторыя Беларусі не выкладалася, і ў школах яна не ўключана ў праграмы навучання. Ён жа ў газеце «Рабочий» у артыкуле «Заканчиваю очерки по истории Белоруссии» паабяцаў чытачам хутка здаць у выдавецтва АН другі том нарысаў па гісторыі Беларусі, а разам з Д. А. Дудковым і К. І. Кернажыцкім закончыць падрыхтоўку зборніка дакументаў па гісторыі Беларусі і прыступіць да напісання падручніка для сярэдніх школ [30].

Намеснік дэкана гістфака Я. І. Карнейчык у артыкуле «Гістарычны факультэт адкрыты» назваў некаторыя лічбы вучэбных гадзін тых курсаў, якія будуць выкладацца на гістфаку. Дык вось, на «гісторыю феадалізму ў Расіі» запланавана 220 вучэбных гадзін, а на «гісторыю феадалізму ў Беларусі» толькі 120 [31]. Гэтыя лічбы магчыма ўдакладніць на падставе архіўных дадзеных. Так, у фондзе 205 НА РБ можна знайсці ўдакладненне газетных радкоў. Так, указаныя дысцыпліны на самой справе пачалі

чытацца на першым курсе гістфака, але першы – гэта «гісторыя СССР да пачатку XX ст.». Ён складаўся з 140 гадзін лекцый і 80 гадзін «прасемінарыяў». А вось на «гісторыю Беларусі» таго ж самага перыяду – 70 і 50 адпаведна. Потым вывучэнне тэмы будзе працягнута: на 2-гім курсе адпаведна – 120 і 70, 60 і 50; на 3-цім – 60 і 70, 40 і 40 адпаведна. Яшчэ будзе дададзены курс па этнаграфіі СССР на 60 гадзін [32, арк. 13–15]. Патрэбна адзначыць, што сярод процьмы спецыяльных і факультатыўных курсаў, у тым ліку і па выбару, большасць была зарыентавана на «гісторыю Расіі-СССР» (нават тыпу – «гісторыя заваявання Сярэдняй Азіі» ці «гісторыя заваявання Каўказа», «гісторыя казацтва», «гісторыя мануфактуры ў Расіі», «гісторыя Карэліі», «гісторыя Крыма» і інш. Праўда, нейкае дачыненне да беларускай гісторыі можна ўгледзіць у курсе «гісторыя Паўночных войнаў», а тым больш – «гісторыя падзелаў Польшчы».

Аб’ява 1936 г. аб прыёме на гістфак БДУ абітурыентаў пазначала наяўнасць спецыялізацый «гісторыя народаў СССР» і «гісторыя Беларусі» [33; 34; 35]. Існаванне вучэбнай дысцыпліны «гісторыя БССР» у рэчышчы «гісторыя СССР» тым не менш давала плён. Студэнты прыхіляліся да грунтоўнага вывучэння айчыннай гісторыі, пайшлі вынікі іх першых даследаванняў. Так, у справаздачы БДУ за 1938/39 вучэбны год пазначана, што работа студэнта Абэцэдарскага (2 курс) «Паўстанне Міхненкі і абарона Мазыра» была надрукавана ў «Саветская Белоруссия» [36, арк. 18].

Стала ўзнаўляцца аспірантура, распачатая Пічэтай яшчэ ў 1925 г. (Ф. Забела, К. Таўсталес-Шыёнак і інш.) і афіцыйна запрацаваўшая з 1927 г. (першымі аспірантамі-беларусістамі былі залічаны К. Кернажыцкі і В. Скардзіс). Між тым хутка яна зышла да нулявой адзнакі. І толькі з адкрыццём гістфаку БДУ запрацавала амаль што поўнавартасна. У першы год дзейнасці гістфака (у 1934/35 навучальным годзе) сярод 19 аспірантаў БДУ на нашым факультэце было 5: з іх адзін па гісторыі БССР (аспірант Шлосберг, н.к. В. К. Шчарбакоў), адзін па гісторыі Польшчы (аспірант ?, н.к. У. М. Перцаў), адзін па гісторыі народаў СССР (аспірант ?, н.к. М. А. Поташ). Два іншых – аспіранты па старажытнай гісторыі Поссэ і Цехановіч [37, арк. 18–19; 38, арк. 6; 39, арк. 5]. Адзначу той факт, што гэтыя аспіранты ў чэрвені 1935 г. здавалі залікі па гісторыі СССР і па гісторыі БССР [40, арк. 131]. Затым прыём у аспірантуру пайшоў планава, хаця па-ранейшаму ў невялікіх маштабах. Так, 25 верасня 1939 г. Наркамат адукацыі БССР зацвердзіў загад рэктара БДУ аб залічэнні 9 аспірантаў – у тым ліку і аднаго па гісторыі СССР, а вось па гісторыі БССР, новай гісторыі і яшчэ раз гісторыі СССР залічэнне было зацверджана толькі 26 снежня. Згадваюцца на гэты час аспіранты кафедры гісторыі народаў СССР В.Ф. Кашпераў і Сацункевіч. Як адзін з першых вынікаў дзейнасці аспірантуры – у газеце «Советская Белоруссія» за 5 снежня 1939 г. рэктарат БДУ даў аб’яву, што адбудзецца абарона кандыдацкай дысертацыі выкладчыка Мінскага педінстытута і аспіранта БДУ Шлосберга Яфіма Паўлавіча на тэму «Беларусія ў перыяд падзелаў Польшчы» (афіцыйныя апаненты – У. І. Пічэта і Д. А. Дудкоў).

Выкладчыкі гістфака, якія працавалі на створанай кафедры гісторыі народаў СССР мелі свой дакладны план НДР сярод агульнафакультэцкіх тэм. Сярод іх дзьве выконваў Я. І. Карнейчык: «Каланіяльная палітыка царызма на Беларусі ў XIX ст. » і «Храналагічны даведнік па гісторыі стражытнага свету, сярэдніх вякоў, новай гісторыі, гісторыі СССР і БССР» [41, арк. 36]. Кафедра вырашыла на сваім пасяджэнні 3 снежня 1939 г. праводзіць адкрытыя слуханні навукова-даследчых дакладаў. Сярод названых былі шэсць тэм па беларускай гісторыі і толькі дзве па гісторыі Расіі, ды і то аспіранцкія! Напрыклад, Д. А. Дудкоў выказаў намер выступіць у красавіку 1940 г. з дакладам «Заходні фронт у перыяд падрыхтоўкі Вял. Кастр. Сац. рэвалюцыі» [42, арк. 3]. Між тым надалей відавочны прыярэтэт замацаваўся за даследаваннем праблем расійскай гісторыі.

Напрыклад, запланаваная тэматыка НДР на 1939–1942 гг. па кафедры гісторыі СССР выглядала такім чынам: тэму «Феодальные отношения в Северо-Восточной Руси XVI в.» распрацоўваў загадчык кафедры і адначасова дэкан А. П. Пьянкоў. А тэма «Социальный строй крепостной вотчины Смоленского края во второй половине XVIII века (социальные отношения в России в XIII в.)» была замацавана па кафедры за У. І. Пічэтай. Прафесар жа з Масквы Я. А. Марахавец кіраваў аспірантамі В. Ф. Кашперавым і В. Г. Корань і адказваў за іх аспіранцкія тэмы «Русская публицистика в годы Крымской войны» і «Крестьянское восстание в селе Бездно (борьба крестьян с помещиками в годы проведения реформы 1861 г.» [43, арк. 103, 104]. Дарэчы, на 7 красавіка 1941 г. на кафедры гісторыі СССР было 6 аспірантаў з усіх 14 гістфак (яе

скончылі без абароны дысертацыі В. Г. Корань, К. І. Шабуня, В. Ф. Кашпераў, Рымбург, Залманава).

Цікавыя дэталі падаюцца ў дзённікавых запісах знакамітага савецкага гісторыка Мікалая Міхайлавіча Дружыніна. Ён, як і многія расійскія сталічныя гісторыкі, не аднойчы ў другой палове 1930-х гг. запрашаўся ў Мінск для выкладання тых ці іншых курсаў для беларускіх студэнтаў і аспірантаў. Гэта для вышэйшай школы БССР быў вымушаны крок, бо свае кадры з канца 1920-х гг. грунтоўна вынішчылі. А для масквічоў і ленінградцаў такія паездкі ў Мінск прыносілі нядрэнны фінансавы прыкуп (дакладныя сумы Дружынін пунктуальна зафіксаваў у сваёй запісной кніжцы). Між тым гісторыкі з Расіі значна пашыралі свой навуковы далягляд, бо і ім было патрэбна акцэнтаваць увагу на не проста «гісторыю СССР», а на «гісторыю народаў СССР». У тым ліку і з боку «гісторыі БССР». Той жа Дружынін адзначае, што ў 1937 г. ён спецыяльна падрыхтаваў лекцыі па гісторыі Беларусі і гісторыі Украіны (другой паловы XIX ст.), але чытаў іх студэнтам не ў Мінску, а студэнтам МДУ і Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута. Камандзіроўкі ў Мінск дазвалялі яму асабіста дакрануцца да некаторых сведчанняў мінулай гісторыі, у якой перасякаліся лёсы ўсходнеславянскіх народаў. Нават, як ён пісаў, пад час вяртання ў чарговы раз з лекцый з сталіцы БССР у сталіцу СССР і гледзячы разам з калегам К. У. Базілевічам праз шкло купэ на «место березинской программы французской “великой армии”» [44, с. 91, 94].

Інтэлектуальныя сілы гісторыкаў БДУ і АН БССР напрыканцы 1930-х гадоў паранейшаму былі зкіраваныя ўладамі на напісанне гаротнага падручніка па гісторыі БССР. У снежні 1938 г. дырэктар Інстытута гісторыі АН БССР М. М. Нікольскі ў артыкуле, надрукаваным у газеце «Звязда», праінфарміраваў, што «брыгада вучоных» у складзе Нікольскі, Лочмель, Пьянкоў і Дудкоў стварыла 1-ю частку падручніка па гісторыі Беларусі для сярэдніх школ і працягвае работу над першай часткай падручніка для ВНУ [45]. У справаздачы БДУ за першае паўгоддзе 1939/1940 навучальнага года адзначана, што Пьянкоў і Лочмель па кафедры гісторыі СССР працуюць над асобнымі главамі першага тома падручніка па гісторыі Беларусі [46, арк. 15]. Вось толькі і створанае, і запланаванае так і не пабачыла свет...

Цікавы, як падаецца, шматзнакавы факт з атмасферы тых складаных гадоў. Да 20-годдзя БДУ загадчык гісторыка-археалагічнага музея ўніверсітэта У. І. Шаўчэнка ў шматтыражцы «За ленінскія кадры» расказаў аб тым, як ствараўся той музей, якім ён кіраваў. Музей быў адкрыты яшчэ ў 1927 г., але хутка яго перадалі ў Мінскі вышэйшы педагагічны інстытут. І толькі 10 лютага 1940 г. экспазіцыя музея была ўзноўлена ў БДУ, хаця яна ў асноўным змяшчала муляжы рарытэтаў з Эрмітажу і знаходкі археалагічных экспедыцый студэнтаў-гісторыкаў у Крым. Да беларускай гісторыі ўсё гэта не мела аніякага дачынення. Пры адкрыцці музея М. М. Нікольскі ў цэнтральнай рэспубліканскай газеце паабяцаў, што ў ім распачата падрыхтоўка і аддзела гісторыі СССР і гісторыі БССР [47]. Аднак і праз год у планах музея і факультэта было прапісана: адкрыць да юбілею ўсяго толькі «выстаўку па гісторыі барацьбы беларускага народа супроць гнёту польскіх паноў, пачынаючы с X стагоддзя». Між тым крыху раней тая ж газета змясціла артыкул студэнтаў чацьвёртага курса гістфака з патрабаваннем стварыць у музеі асобны аддзел гісторыі Беларусі. Моладзь пісала: «Мы не можам сабе ўявіць, чаму да гэтага часу ў гістарычным музеі Беларускага ўніверсітэта няма аддзела, паказваючага многавекавую гісторыю беларускага народа». І крэатыўна мыслячыя студэнты прапанавалі, каб гэты аддзел быў «добра аформлены, дастойны ўніверсітэта» [48]. Але вайна прыпыніла рэалізацыю і планаў, і прапаноў.

А потым прыйшоў час фашыскай акупацыі, як і час узнаўленне работы БДУ ў складзе ўсіх яго шасці факультэтаў на станцыі Сходня пад Масквой восенню 1943 г. Саюзная «Учительская газета» за 16 июня 1943 г. надрукавала артыкул вучонага сакратара Савета БДУ У. І. Шаўчэнкі аб распачынанні дзейнасці ўніверсітэта, у якой у тым ліку канстатавалася радыкальна новая рэч: «Создается новая кафедра – истории Белоруссии, руководителем которой будет Т. С. Горбунов, секретарь ЦК КП(б) Белоруссии по пропаганде». А калі зыходзіць з дакладна-афіцыйнага факта, то патрэбна саслацца на Архіў БДУ. У ім маецца сведчанне аб тым, што 2 жніўня 1943 г. загадчыкам кафедры гісторыі БССР быў зацверджаны дацэнт Ц. С. Гарбуноў [49, арк. 1]. Праўда, кафедра не «гісторыі Беларусіі», а «гісторыі БССР». Па сутнасці ўпершыню ўлады адважыліся на стварэнне сваёй, нацыянальна-гістарычнай інстытуцыі, якая павінна была сканцэнтраваць сілы па вывучэнню і выкладанню айчыннай гісторыі як самадастатковай праблемы. Праўда, сіл гэтых было не шмат, але якія па статусу свайму! Загадчык і прафесар (на палову стаўкі) – партыйны сакратар-ідэёлаг! Дацэнт

без навуковай ступені, але сам рэктар універсітэта П. П. Савіцкі! Абодвух зацвердзіў на пасадах Вучоны Савет універсітэта рашэннем ад 9 лістапада 1943 г. [50, арк. 95]. І яшчэ быў зафіксаваны па гэтай кафедры дацэнт Д. А. Дудкоў. Зразумела, узноўлена была і кафедра гісторыі народаў СССР начале з маскоўскім акадэмікам Г. М. Панкратавай (былы загадчык А. П. П’янкоў прыехаў з роднай Пярмі–Молатава ўсяго толькі на пасаду дацэнта) [51, арк. 10].

Пасля звароту БДУ ў родны Мінск на 1945/46 вучэбны год у штаце кафедры гісторыі БССР працавалі: той жа загадчык, але ўжо дацэнт Т. С. Гарбуноў і старшы выкладчык Ф. Т. Канстанцінаў. Прысутнасць Фёдара Трафімавіча ў якасці ўсяго толькі выкладчыка не панізіла статутнасць новай кафедры, а наадварот, – яна на кароткі час набыла пэўную выключнасць у структуры БДУ. Гэты ураджэнец Беларусі (1915 г., з-пад Чаус) быў работнікам ЦК ВКП(б), членам рэдкалегіі часопіса «Славяне», а ў хуткім часе і газеты «Правда”. Вось толькі як беларусазнаўца, мабыць, ён быў не зусім дасведчаны, бо схіляўся да гісторыі Балгарыі, а у большай ступені праслыў як савецкі філосаф (нават стаў прэзідэнтам Філасофскага таварыства СССР). Асноўная вучэбная нагрузка выконвалася моладдзю – да выкладання былі далучаны аспіранты-франтавікі А. І. Сідарэнка і Л. С. Абэцэдарскі [52, арк. 109; 53, арк. 48]. Таму не дзіўна, што загадам Камітэта па справах вышэйшай школы пры СНК СССР 29 мая 1946 г. дацэнт Ц. С. Гарбуноў быў зацверджаны толькі «выконваючым абавязкі» загадчыка кафедры гісторыі БССР па сумяшчальніцтву [49, арк. 20].

Відавочна тое, што новая кафедра павінна была ўліць новыя сілы ў актуальную, але такую балючую праблему напісання сістэмнай беларускай гісторыі. Загадчык Гарбуноў разлічваў на канцэнтрацыю сіл – універсітэцкіх і акадэмічных з прыцягненнем сваіх высокіх партыйных паўнамоцтваў. У 1948 г. нарэшце справа напісання сістэматызаванай гісторыі БССР як бы набыла абрысы, набліжаныя да выдавецкага варыянта. Па крайней меры аб гэтым аўтарскі калектыў паспрабаваў заявіць, надрукаваўшы ў партыйным часопісе «Тэзісы аб асноўных пытаннях гісторыі БССР». Праўда, каб зняць з сябе пэўную частку адказнасці за навуковую і ідэялагічную выверанасць артыкул быў пададзены «У парадку абмеркавання» [54].

Прачытваючы ў каторы раз гэтыя Тэзісы» з алоўкам ў руках, так і карціць падкрэсліць амаль кожны радок, праставіць на палях старонак часопіса ці то пытальнікі, ці то клічнікі, ці нават сучасныя кампутарныя смайлікі. Так відавочна спрошчана ў рэшце рэшт была прачытана найскладанейшая і заблытаная наша гісторыя. Справа, аказваецца, была не толькі ў адсутнасці ў Беларусі «сур’ёзных марксісцкіх даследаванняў па асобных буйных пытаннях гісторыі нашага народа», але зноў, у каторы раз – вялікую шкоду рабілі і працягваюць рабіць «антынавуковыя, ілжывыя, скажоныя» працы даўно сканаўшых Каяловіча. Данілевіча, Любаўскага, Доўнар-Запольскага і толькі-толькі памерлага Пічэты. Уладзіміра Іванавіча хоць і не назвалі сярод безымянных гісторыкаў «з лагера беларускіх нацыяналістаў», але ўлічылі «у памылках нацыяналістычнага характару» [54, с. 36]. Так што па сутнасці толькі яго прозвішча і прагучала ў такім «гордым адзіноцтве» – чамусці складальнікі тэзісаў (а гэта сябры Пічэты – акадэмікі М. М. Нікольскі і У. М. Перцаў, дастаткова яго ведаўшыя К. М. Палікарповіч, Е. І. Карнейчык, А. П. П’янкоў, К. І. Шабуня, Е. П. Шлосберг, як і А. І. Воранава, Н. В. Каменская, С. Н. Малінін, П. В. Саевіч) такім чынам выказалі сваю «удзячнасць» навукоўцу, так зашмат зрабіўшаму ў імя асваення цаліны гістарычнага беларусазнаўства.

Ну, не буду надалей на гэтым засяроджвацца... Пакінем для іншага выпадку сваё прачытанне тых завалаў, праз якія прадзіраліся нашы старэйшыя калегі.

Кафедра не паспела набраць моцы пад кіраўніцтвам такой заангажаванай на «гістарычным фронце» Беларусі асобы, як загадам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР ад 30 кастрычніка 1948 г. Ц. С. Гарбуноў быў вызвалены ад абавязкаў і пасады – у сувязі з выездам на працу за межы БССР [49, арк. 32]. Загадчыкам кафедры прызначылі Ніну Васільеўну Каменскую. Яна нават не паспела ўвайсці ў стан праблем, як новым міністэрскім загадам № 719/к ад 26 лістапада 1949 г. кафедра гісторыі БССР была аб’яднана з кафедрай гісторыі СССР. Пасляваенная эйфарыя хутка прайшла, і ўзнікшы ў палітычных хвалях крэн да шырокага прыхілення да нацыянальнай гісторыі зноў быў «выпраўлены» уладнай рукой. Беларуская гісторыя ўвайшла складнікам у адукацыйна-навуковую праблематыку кафедры гісторыі СССР гістфака БДУ.

І гэтая кафедра павінная была ўзяць пад свой кантроль і нарэшце асіліць напісанне падручніка, а дакладней – сітэматызаванай гісторыі БССР (як гісторыі Беларусі, зразумела). Як гэты працэс ажыццяўляўся ў новых акалічнасцях, без падрабязнасцяў,

можна адчуць з успамінаў Рахіль Абрамаўны Нікольскай (рукапіс яе ўспамінаў аб перажытым маецца ў асабістым архіве аўтара – с. 27–28).

Рахіль Абрамаўна пасля распавядання аб перадваенных часах і часах акупацыі, аб неварогодным пераходзе свайго навуковага кіраўніка і будучага мужа з Мінска ў партызанскі атрад, а потым аб пералеце ў красавіку 1944 г. у Маскву піша: «По прибытии в Москву Николай Михайлович сразу приступил к исполнению своих служебных обязанностей: Директора института истории АН БССР и заведующего кафедрой истории древнего Востока (сапраўды – гісторыі старажытнага свету. – аўт.) Гос. университета БССР. За время пребывания Николая Михайловича в Москве им было заложено начало создания книги по истории Белоруссии с древнейших времен. Вместе с академиками Пичетой Владимиром Ивановичем и Панкратовой Анной Михайловной был создан подробный перечень глав и начался поиск авторского коллектива. Работа над этим изданием продолжалась, как вы сами знаете, много лет, не обошлось без очень острых дискуссий».

Распавяданне ўтрымлівае і цікавую інфармацыю аб тым, як раз'юшаны Нікольскі размаўляў з сакратаром ЦК КП)б)Б (і, згадваю, адначасова загадчыкам кафедры гсіторыі БССР БДУ. – аўт.), патрабуючы скасавання ўказання аб звальненні з Інстытуту гісторыі некалькі яго навукоўцаў яўрэйскага паходжання (М. Я. Грынблата, З. Ю. Капыскага, З. Е. Абезгауза, А. М. Карпачова). І змог адстаяць сваіх калег.

Далей не абыйсціся без звяртання да постаці Л. С. Абэцэдарскага. Ён увайшоў у гісторыю БДУ як студэнт, аспірант, выкладчык, дацэнт, прафесар. І як загадчык двух «неспакойных» па свайму прызначэнню і грамадска-палітычнаму ўспрыняццю кафедр – спачатку кафедры «гісторыі СССР», а з верасня 1958 г. і да заўчаснай смерці ў ліпені 1975 г. – кафедры «гісторыі БССР» [55, арк. 1–4]. Ён увасобіў карэнныя сутнасныя асаблівасці арганізацыйнага, вучэбнага, навуковага суправаджэння айчыннай гісторыі на працягу канца 1940 – сярэдзіны 1970-х гг. Ці то гэты гісторык меў уплыў на афіцыйнае, уладнае ўспрынящце беларускай гісторыі, ці наадварот – як ніхто з калег лепш успрымаў партыйна-урадавыя ўстаноўкі наконт таго, якой усё ж была гісторыя беларусаў. І ўмела і нават жорстка праводзіў іх у жыццё праз сістэму школьнай і ўніверсітэцкай адукацыі, праз вызначэнне «актуальных" тэм для даследаванняў і кантроль за іх выкананнем аспірантамі, дыпломнікамі, курсавікамі. Але відавочна, што ён некалькі дзесяцігоддзяў лічыўся «заканадаўцам мод". Можна нават меркаваць, што гісторык сам наўмысна іх шукаў, усюды ідучы наперад «з адкрытым забралам» – у пастаноўцы і абмеркаванні навуковых пытанняў, у ва ўзаемаадносінах з калегамі і нават «зялёнымі» першакурснікамі, у дачыненнях з начальствам.

Аналізуючы ж сітуацыю з вывучэннем і выкладаннем гісторыі Беларусі ў гэтыя пасляваенныя некалькі дзесяцігоддзяў, сёння можна спаслацца на шматлікія крыніцы: ад архіўных матэрыялаў да ўспамінаў тых, хто сам быў дзейснай асобай тых працэсаў. І аўтар мае такую магчымасць увесці у распавяданне некаторыя асабістыя ацэнкі, бо з'яўляецца выхаванцам кафедры гісторыі БССР БДУ і дыпломнікам Л. С. Абэцэдарскага. Але гэты намер пакіну для іншага выпадку.

Патрэбна заўважыць, што дзейнасць кафедры «гісторыі БССР» нельга лічыць поўнавартаснай. Калі проста толькі без дакладных доказаў прыкінуць, што такога гэтая кафедра за час свайго існавання змагла зрабіць, то на памяць не прыходзяць нейкія грунтоўныя навуковыя распрацоўкі, не былі напісаны ўніверсітэцкія падручнікі, не было падрыхтавана зашмат дысертацыйных прац. Усе лічбы на гэты конт відавочна сціплыя. І не магла б кафедра спаборнічаць, хаця б знешне, с кафедрай «гісторыі СССР», калі б яе не ўзначальваў такі загадчык, як Абэцэдарскі. Можна нават лічыць, што ягоная постаць як бы прыкрывала «ляльку», ці даніну ад улад пэўным памкненнем беларусаў да самавыражэння, у тым ліку праз навуку і адукацыю. А можа ён і сам намагаўся зрабіць з кафедры (да і зрабіў па сутнасці) такую шырму, якая прыкрывала сутнасць, адводзіла «пар» студэнцка-інтэлектуальных патрыятычных парываў.

Можна было падвесці грунтоўную базу доказаў пад гэтыя некалькі эмацыянальныя заўвагі. Але відавочна, што выкладанне гісторыі Беларусі, а тым больш навуковая яе распрацоўка для кафедры было не вельмі складанай справай. Уся ўвага канцэнтравлася на дзейнасці кафедры «гісторыі СССР», якая набыла ў вышэйшых навучальных установах усяго СССР статус, амаль што роўны кафедры «гісторыі КПСС». Аб'ём вучэбных гадзін на айчынную гісторыю раз за разам змяняўся ў бок памяшшэння. У адрозненне ад гісторыі СССР, якой студэнцтва «напаўнялася» амаль што на працягу ўсіх гадоў навучання.

Студэнт гістфаку пачатку 1960-х гг., наш калега дацэнт Іван Апанасавіч Літвіноўскі ўзгадвае цікавыя абставіны спробы БДУ надаць падрыхтоўцы гісторыкаў (на 1962/63 навучальны год) як бы сучасны характар, адпавядаючы пашэрэнню міжнародных стасункаў СССР. У якасці эксперымента тады распачалі падрыхтоўку настаўнікаў-гісторыкаў з веданнем адной з трох замежных моў (ангельскай, французскай, нямецкай). Былі створаны спецыяльныя падгрупы, выпускнікі якіх павінны былі выкладаць гісторыю ў школе на замежнай мове (меркавалася, што ў шэрагу школ Беларусі будуць адчынены адпаведныя класы з паглыбленым вывучэннем замежнай мовы і з выкладаннем на ёй прадметаў школьнага цыклу). Пад эксперымент папала амаль палова першага курса гістфака гэтага году набора. З сучаснага погляду, без сумнення, гэта была добрая ініцыятыва кіраўніцтва беларускай сістэмы адукацыі. Але тут прысутнічала дзіўная акалічнасць: вучэбныя гадзіны для пашырэння заняткаў па замежных мовах «знайшлі» за кошт скарачэння агульнага курса гісторыі Беларусі і дысцыплін спецыялізацыі! І на такі крок гістфак БДУ чамусці вымушаны быў пайсці ва ўмовах, калі ўжо некалькі гадоў дзейнічала адмысловая кафедра гісторыі БССР. Удалося зрабіць два выпуска спецыялістаў з «эксперыментальнай» падрыхтоўкай, а потым адмовіцца. Між тым беларускі складнік у падрыхтоўцы беларускіх гісторыкаў з універсітэцкім дыпломам амаль што не быў павялічаны. Не паглыбляючы разважанні на гэты конт, нельга не заўважыць сувязі дадзенага эксперыменту з тагачаснымі эксперыментамі ва ўсіх накірунках – ад палітыкі да культуры.

На гэтым павінен абарваць свой расказ, бо да пачатку 1990-х гг. нічога істотнага ў інстытуцыянальным плане не мянялася. На шостым паверсе Галоўнага корпуса БДУ ў сціпленькім аднавокнавым пакоі прытулілася «кафедра Абэцэдарскага» – зразумела, кафедра «гісторыі БССР» як не вельмі прыкметная, а тым больш вызначальная частка структуры гістфака і ўсяго ўніверсітэта. Вядома, што яе пасля смерці заснавальніка будуць узначальваць вельмі розныя па сваіх навковых поглядах гісторыкі: і Аляксандр Пятровіч Ігнаценка, і Валянціна Уладзіміраўна Чапко, і Іраіда Восіпаўна Царук.

Сутнасныя характарыстыкі істотна не змяняліся ў яе адукацыйнай і навуковай рабоце. І ты не менш з году ў год накопліваліся сілы, каб праз час разгарнуцца ў дзве поўнавартасныя, найважнешыя кафедры па выкладанню і даследаванню ўсіх магчымых накірункаў нашай – айчынаай гісторыі, а галоўнае – па падрыхтоўцы ўсё новых і новых пакаленняў беларусістаў. Тых, хто па-сапраўднаму прафесійна і аддана будзе глыбока спасцігаць сваю, нашу, беларускую гісторыю, стварыць сучаснае беларусазнаўства. Напрыклад, і сёння яшчэ толькі (ці ў каторы раз?) замацоўваецца ў беларускім навуковым асяроддзі тэза аб тым, што менавіта паўстанне 1863–1864 гг. паўплывае на зацвярджэнне беларусазнаўстава як асобнага і важнага накірунку гістарычных ведаў. Згадваюцца найперш працы Мікалая Нікіфароўскага (дарэчы, першага настаўніка Уладзіміра Пічэта. – *Аўт.*), Яўхіма Карскага, Мітрафана Доўнар-Запольскага, да якіх аўтараў рубяжу XIX–XX стст. падштурхнулі ідэі, погляды, постаці таго паўстання [56, с. 6, 8].

Цяперашні стан інстытуцый у рэчышчы беларусазнаўства, адукацыйныя, навуковыя, арганізацыйныя напрамкі зыходзяць з гадоў, якія пражывалі нашы папярэднікі, нашы настаўнікі. Пры ўсіх сучасных дасягнутых узроўнях ведаў забываць гэтае – азначае страціць годнасць гісторыка.

**Бібліяграфічныя спасылкі:**

1. Падлічана аўтарам па: Владимир Иванович Пичета. Библиографический указатель / Сост. Е. Я. Дукор. Минск : Изд-во БГУ, 1978.
2. Існуюць і іншыя падлікі: П. Ф. Дзмітрачкоў чамусці называе значна меншыя адпаведныя суадносіны лічбаў (гл. Дмитрачков П. Ф. Ведение в историю Беларуси. – Могилев : УО «МГУ имени А. А. Кулешова», 2012.
3. Архіў Упраўлення Федэральнай службы бяспекі Расійскай Федэрацыі па Санкт-Пецярбургу і Ленінградскай вобласці. Архіўная крымінальная справа № П–65245. У 19 т. Т. 9.
4. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Ф. 147. Воп. 2. Спр. 11.
5. Пичета В. И. История белорусского народа // Курс белорусоведения. Лекции, читанные в Белорусском народном университете в Москве летом 1918 года. М., 1918–1920. С. 1–84.
6. Кром М.М. Между Русью и Литвой. Пограничные земли в системе русско-литовских отношений конца XV – первой трети XVI в. 2-е изд., испр. и доп. М.: Квадрига; Объед. ред. МВД России, 2010.
7. Савецкая Беларусь. 1922. 2 лістапада.
8. Савецкая Беларусь. 1923. 3 кастрычніка.

9. У. Ігнатоўскі. Кароткі нарыс нацыянальна культурнага адраджэння Беларусі / Лекцыі, чытаныя для студэнтаў Менскага Педагагічнага Інстытуту ў г. Яраслаўлі ў 1917–1918 року. Менск, 1921.
10.Турук Ф.Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов. М.: Госиздат, 1921.
11. Довнар-Запольский М. В. Народное хозяйство Белоруссии 1861–1914 гг. Минск: Изд. Госплана БССР, 1926.
12. Пічэта У. І. Гісторыя Беларусі. Ч. 1. М.:Л. : Дзяржвыд., 1924.
13. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НА РБ). Ф. 205. Воп. 3. Спр. 3190.
14. Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. 1922. Вып. 11–12.
15. Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. 1921. № 1.
16. Кончаловский Д. П. Воспоминания и письма (От гуманизма к Христу). Paris: Librarie des cinq continents, 1971.
17. Пічэта У. І. Формы нацыянальнага й опозыцыйнага руху на Беларусі // Полымя. 1924. № 2.
18. Тэпін В. З успамінаў // Беларуская газэта. 1943. 29 верасня.
19. Вестник Народного Комиссариата Просвещения ССРБ. 1922. Вып. 7–8.
20. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 12.
21. Праф. М. М. Піотуховіч. Старонка успамінаў // Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт. 1921–1927. Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Менск, 1927.
22. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 127.
23. Исторический факультет БГУ, 80 лет / сост.: А.А. Прохоров, О.А. Яновский, А. М. Назаренко. Минск : БГУ, 2014.
24. В.І. Пічэта. Беларусі Дзяржаўны Унівэрсытэт напярэдадні 10-годзьдзя Кастрычнікавай Рэвалюцыі // Да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Менск, 1927. С. 5–46.
25. Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. 1921–1841 / склад.: С.М. Ходзін, М. Ф. Шумейка, А. А. Яноўскі. Мінск : БДУ, 2006.
26. Батвіннік Марат. «Першы рэктар палітычны зняволены» // Голас Радзімы. 1996. 17 кастрычніка. № 42.
27. Звязда. 1934. 5 жніўня.
28. Звязда. 1934. 27 жніўня.
29. Звязда. 1935. 6 студзеня.
30. Рабочий.1936. 5 апреля.
31. Рабочий. 1934. 9 сентября.
32. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1316а.
33. Рабочий. 1936. 10 июня.
34. Звязда. 1936. 22 ліпеня.
35. Звязда. 1936. 22 жніўня.
36. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 716.
37. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 606.
38. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 633.
39. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1316а.
40. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 646.
41. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 607.
42. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 725.
43. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 737.
44. Вопросы истории. 1997. № 6.
45. М. М. Нікольскі. XX гадоў гістарычнай навукі ў БССР // Звязда. 1938. 28 снежня.
46. НА РБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 732. Л. 15.
47. Никольский Н. Музей при Белорусском Государственном Университете // Советская Белоруссия. 1940. 16 февраля.
48. За ленінскія кадры. 1941, люты.
49. Архіў БДУ. Спр 70, да 1974 г.
50. НА РБ. Ф. 205. Оп. 5. Спр. 971.
51. НА РБ. Ф. 205. Оп. 5. Спр. 45.
52. НА РБ. Ф. 205. Оп. 5. Спр. 62.
53. НА РБ. Ф. 205. Воп. 5. Спр. 140.
54. Тэзісы аб асноўных пытаннях гісторыі БССР // Большэвік Беларусі. 1948. № 8. С. 36–71.
55. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 3.
56. Роля паўстання 1863–1864 гадоў у гісторыі Беларусі (да 155-годдзя з часу завяршэння паўстання // Беларускі гістарычны часопіс. № 11. С. 3–12.